жаўнай незалежнасці БНР, асабліва на ўзроўні унутранага упраўлення, выпрацоўкі і рэалізацыі законаў, кантролю за іх выкананнем, абароны сваіх грамадзян было б вялікім перабольшваннем.

У звычайным сэнсе БНР дзяржавай не была. Фактычна Рада БНР, Народны Сакратарыят выконвалі функцыі нацыянальнага прадстаўніцтва пры акупацыйнай адміністрацыі.

## ДА ПЫТАННЯ АБ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІМ ЖЫЦЦІ БЕЛАРУСКАЙ ВЕСКІ У 1921-1928 гг.

М.А.Бяспалая

Культурнае асветніцтва заўсёды лічылася карыснай і высакароднай справай. Нават у самыя змрочныя часы нашай гісторыі можна знайсці шмат прыкладаў бескарыснага служэння свайму народу на ніве асветніцтва. Патрэба ў гэтай працы не знікне і ў будучым, толькі кожны час ставіць і будзе ставіць свае патрабаванні і ствараць свае формы і метады культурна-асветніцкай работы.

У разглядаемы перыяд, згодна з тагачаснай тэорыяй, культурная праца набыла, можна сказаць, не зусім разумныя памеры і накіраванасць. Асабліва добра гэты працэс адбіўся ў жыцці беларускай вескі, якая за дзесятак гадоў савецкай улады перажыла столькі эканамічных і палітычных пераўтварэнняў, якіх хапіла б на цэлыя стагоддзі. Над вёскай ставіўся эксперымент, у тым ліку, і ў культурнай вобласці. Адначасова вырашалася шмат задач, сярод іх галоўная: надзяленне сялян зямлёй, таму што больш паловы гаспадарак былі малазямельнымі і беднацкімі; адзначым, што якраз гэтае пытанне дзяржавай так і не было даведзена да канца. Затое ад сялянства патрабавалася тэрміновае аднаўленне ворыўнай плошчы і дасягненне даваеннай ураджайнасці. У 1925 г. вялікім напружаннем усіх сіл гэта задача была выканана.

Але гэтага было мала, таму што дзяржава патрабавала сродкі на аднаўленне прамысловасці, а потым на індустрыялізацыю, на ўвядзенне залатога чырвонца, на дапамогу бастуючым англійскім гарнякам і г.д. Узяць можна было толькі ў вёсцы і яе захлынулі падаткі, якія збіраліся жорстка, прычым захоўваўся т.зв.класавы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падыход, калі бедныя альбо зусім не плацілі, ці плацілі мала, затое больш-менш заможная гаспадарка расплачвалася спаўна. У 1921-22 гг. вельмі гвалтоўна узімалі харчовы падатак па НЭПу, потым амаль штогод уводзіліся новыя падаткі, прычым яны увесь час павялічваліся. Вядома, такая дзяржаўная палітыка не спрыяла спакою ў весцы, не стварала магчымасцей дзеля хуткага росту гаспадаркі, яе удасканальвання, а таксама адмоўна адбівалася і на рашэнні другіх задач, у тым ліку і асветніцкіх, якія стаялі перад вескай.

Улічваючы стан беларускага сяла у 20-я гады, можна лічыць сельскагаспадарчая асветніцтва адной з найважнейшых задач. Яшчэ да вайны пры дапамозе земств выпускалася, праўда невялікімі тиражамі, сельскагаспадарчая літаратура. Гэта традыцыя была падоўжана і ў 20-я гады, але вельмі марудна і не вялікую ролю ў якасным пераўтварэнні вескі магі адыграць сельскагаспадарчыя курсы, школы, пачатак якіх таксама трэба адносці да вайны. Але ў разглядаемы перыяд гэтая праца тармазілася адсутнасцю дастатковай колькасці спецыялістаў, хоця дзе-ні-дзе працавалі сельскагаспадарчыя курсы, арганізаваліся паказальныя вучасткі і гаспадаркі з навуковым кармленнем жывелы. У другой палове 20-х гадоў практыкавалася праводзенне спецыяльных сельскагаспадарчых выставак як у раенах, так і акругах, а таксама перасоўных, якія ў зімовы час пераезджалі з вескі ў вёску, збіраючы вялікія натоўпы людзей. На іх сяляне знаёміліся з лепшымі гаспадаркамі, лепшымі сартамі і пародамі жывелы, больш перадавымі метадамі вядзення гаспадаркі.

Значную ролю ў праводзенні аграрна-асветніцкай работы адыгралі культурна-асветніцкія установы. У 20-я гады ў асноўным сфарміравалася сістэма іх, ніжэйшым звяном якой з'яўляліся вясковыя хаты-чытальні і народныя дамы ў буйных сёлах. Асноўная маса іх не вельмі, а можна сказаць і зусім прыстасавана да правядзення якаснай культурна-асветніцкай работы, таму што, як заўседы не хапала сродкаў на абсталяванне і на аплату культасветработнікаў. Стагоддзямі нататкі сусветнай культуры неслі ў масы самыя адукаваныя людзі, а ў савецкі час была надзейная дзяржаўная сістэма не асветніцтва, а прапаганды новых пралетарскіх святаў, абрадаў, вечароў і г.д. У тыя часы існавала вялікая праблема з кадрамі, фактычна не было не аднаго спецыяліста, у асноўным культ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асветнікамі назначаліся людзі з пачатковай адукацыяй. Але цэнтральныя ўлады не звярталі ўвагі на гэтыя абставіны і патрабавалі ад хат-чытален разнабаковай работы. Дакументы таго часу прыводзяць мноства лічбаў аб самых разнастайных культурных мерапрыемствах: ад камуністычных "акцябрын" і безалкагольных вяселляў да масавых святаў ураджаю. Актыўны ўдзел у асветніцкай дзейнасці прымала студэнцтва, настаўнікі, аграномы і вандроўны тэатр пад кіраўніцтвам У.Галубка. Але асноўны цяжар штодзённай працы лажыўся на клубнага работніка. Ён павінен быў рабіць усё: і выдаваць спраўкі і праводзіць палітінфармацыі, арганізоўваць антырэлігіёзныя, ці сельскагаспадарчыя, ці ваенныя гурткі, афармляць т.зв. "ленінскія" ці мопраўскія куткі, ставіць спектаклі, збіраць грошы на розныя палітычныя кампаніі, праводзіць агітацыю. Можна ўявіць якога ўзроўню магла быць гэтая работа, а можна і пасумнявацца, ці была яна наогул, ці толькі пісаліся справаздачы.

Такім чынам, у 20-я гады беларуская вёска павінна была вялікім напружаннем сваіх сіл адначасова выканаць мноства дзяржаўных планаў. Некаторыя былі здзейснены, некаторыя толькі пачаліся, як, напрыклад, кааперацыйны рух, і былі спынены калектывізацыяй, а другія, у тым ліку і культурна-асветніцкая работа, захаваліся амаль без змен да нашых дзён. Да нядаўняга часу яна заставалася такой жа палітызаванай як і ў 20-я гады, захаваліся амаль тыя ж праблемы ў кадравай палітыцы, у фінансаванні ўстаноў культуры, у формах і метадах працы. І задачы, якія стаяць сення перад культурна-асветніцкімі ўстановамі, на самой справе, надта важныя і патрэбныя.

## ВЫДАННЕ БЕЛАРУСКАМОЎНАЙ ЛІТАРАТУРЫ БЕЛАРУСІ
## (параўнальны аналіз)

Г.Н.Семіна
Т.І.Тарашкевіч
А.І.Фядорына

З мэтай высвятлення стану выканання законаў аб культуры і мове ў Беларусі выдавецтвамі рэспублікі аўтарамі прааналізаваны дакументальна-інфармацыйны паток беларускамоўных выданняў.